МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

АБАВЯЗКОВАГА ФАКУЛЬТАТЫЎНАГА КУРСА
ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

# АСНОВЫ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

## II—IX класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 373.121.414:373.3/.5:614.8.084
ББК 74.266.8
П78

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
абавязковага факультатыўнага курса
для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

# АСНОВЫ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

**II—IX класы**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *К. І. Іванова*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктар *Л. А. Міснікевіч*

Падпісана ў друк 18.06.2012. Фармат 60×84/16. Папера газетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 2,56. Ул.-выд. арк. 1,9.
Тыраж 3600 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494469
ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Мінскае абласное ўнітарнае прадпрыемства «Барысаўская ўзбуйненая
друкарня імя 1 Мая». ЛП № 02330/0150443 ад 19.12.2008.
Вул. Будаўнікоў, 33, 222120, г. Барысаў

**ISBN 978-985-559-088-1**

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праблема бяспекі жыццядзейнасці чалавека ў сучасных умовах — адна з самых актуальных. Падзеі, якія адбываюцца ва ўсім свеце, сведчаць пра павелічэнне тэхнагеннай, прыродагеннай і сацыягеннай небяспекі для жыцця чалавека, паказваюць прамую залежнасць стабільнасці цэлых дзяржаў і выжывальнасці народаў ад узроўню падрыхтаванасці падрастаючых пакаленняў да распазнавання і папярэджання небяспекі, ад сістэмы грамадскіх і індывідуальных механізмаў абароны дзяржавы і кожнага чалавека паасобку.

Падрыхтаваць чалавека да надзвычайных сітуацый, уменне знаходзіць выйсце з сітуацый, небяспечных для жыцця і здароўя, магчыма шляхам фарміравання ў яго сістэмы ведаў пра асновы бяспекі жыццядзейнасці чалавека і грамадства, набыцця практычных навыкаў аховы жыцця і здароўя, фарміравання вопыту бяспечнай жыццядзейнасці.

У дырэктыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» ўказана на неабходнасць арганізоўваць ва ўсіх калектывах і па месцы жыхарства навучанне грамадзян дзеянням у надзвычайных сітуацыях, на прадугледжанне мер па стварэнні дзяржаўнай сістэмы папярэджання надзвычайных сітуацый у рэспубліцы. Важнай састаўной часткай сістэмы грамадскай бяспекі з'яўляецца навучанне падрастаючага пакалення асновам бяспечнай жыццядзейнасці. Заняткі па асновах бяспекі жыццядзейнасці і дапрызыўная падрыхтоўка навучэнцаў арганічна ўваходзяць у адзіную сістэму ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання моладзі ў Рэспубліцы Беларусь.

Дадзеная вучэбная праграма ўяўляе сабой кароткі тэматычны выклад зместу дадзенага курса, які ўключае веды пра асновы бяспечнай жыццядзейнасці чалавека, небяспечныя і шкодныя фактары рознага паходжання, спосабы, метады і прыёмы

засцярогі чалавека ад іх уздзеяння, меры бяспекі ў надзвычайных умовах.

***Мэта*** абавязковага факультатыўнага курса — выхаванне ў вучняў адказных адносін да асабістай і грамадскай бяспекі і фарміраванне ў іх вопыту бяспечнай жыццядзейнасці.

***Задачы*** факультатыўных заняткаў:

- навучыць вучняў уменню распазнаваць і ацэньваць небяспеку навакольнага асяроддзя;
- раскрыць сістэму ведаў пра небяспеку рознага паходжання, меры па яе прадухіленні, ліквідацыі яе вынікаў;
- прывіць вучням навыкі засцярогі і самазасцярогі, дапамогі і ўзаемадапамогі ў сітуацыях, небяспечных для іх фізічнага, псіхалагічнага здароўя і жыцця.

Вучэбная праграма складаецца з чатырох раздзелаў («Правілы дарожнага руху», «Правілы пажарнай бяспекі», «Ахова ад надзвычайных сітуацый», «Ахова жыцця і здароўя») і пабудавана на аснове наступных прынцыпаў: улік узроставых асаблівасцей вучняў, поліцэнтрызм, спалучэнне псіхалагічнага і культуралагічнага суправаджэння, сістэматычнасць.

Адметнымі асаблівасцямі праграмы з'яўляюцца ўключэнне ў яе больш шырокага спектра сацыягеннай небяспекі, якія звязаны з рэальным вопытам узаемаадносін вучняў з людзьмі, а таксама апора на эмацыянальны вопыт аховы асобы ад цэлага шэрагу небяспечных сітуацый.

Раздзелы вучэбнай праграмы маюць уласныя ўнутраныя прынцыпы пабудовы матэрыялу і фармуліроўкі тэм. Агульным прынцыпам пабудовы ўсёй вучэбнай праграмы, які аб'ядноўвае яе раздзелы, з'яўляецца прынцып пашырэння сацыяльнага вопыту бяспечнай жыццядзейнасці вучняў.

Вучэбная праграма прадастаўляе педагогам магчымасць творча падысці да планавання заняткаў у залежнасці ад канкрэтных умоў установы агульнай сярэдняй адукацыі, мясцовасці, дзе яна знаходзіцца, псіхалагічных магчымасцей вучняў і арганізацыйных рэсурсаў. Выключэнне складаюць заняткі, непасрэдна звязаныя сваім зместам з парой года, напрыклад, «Восеньскія пажары», «Правілы бяспечных паводзін у вадзе» і г. д.

Структура праграмы ўлічвае асаблівасці навучання вучняў рознага ўзросту. Усе раздзелы пабудаваны па прынцыпе разгортвання сістэмы ведаў ад простага да складанага, каб у вуч-

няў ад класа да класа выпрацоўвалася псіхалагічная гатоўнасць да цяжкіх і небяспечных сітуацый у рэальным жыцці, у іх кантактах з прыродай, тэхнікай, людзьмі.

Вывучэнне матэрыялу, які патрабуе вялікіх затрат часу, можа быць завершана на занятках з атрадамі юных выратавальнікаў, юных інспектараў дарожнага руху.

Навучальны год можна завяршыць правядзеннем Дня аховы дзяцей у выглядзе аб'ектавай трэніроўкі (падрыхтоўка вучняў і персаналу да дзеянняў у надзвычайных сітуацыях).

Пры арганізацыі заняткаў неабходна практыкаваць правядзенне сустрэч са спецыялістамі (у адпаведнасці з вывучаемымі тэмамі).

Колькасць гадзін, прадугледжаных праграмай: II—IV класы — 16 гадзін на год, V—VII класы — 35 гадзін на год, VIII—IX класы — 35 гадзін на год.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь:

- правілы дарожнага руху і бяспечных паводзін пешаходаў і пасажыраў, якія ўдзельнічаюць у дарожным руху, прычыны дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей і правілы паводзін падчас іх; правілы бяспечных паводзін на чыгунцы; знакі дарожнага руху і разметку, сігналы святлафора, правілы дарожнага руху ў населеных пунктах і па-за імі; правілы аказання першай даўрачэбнай дапамогі; правілы руху групамі і ў калоне; правілы дарожнага руху для вадзіцеляў мапедаў, матацыклаў, веласіпедаў; аб адказнасці ўдзельніка дарожнага руху за парушэнне патрабаванняў заканадаўства па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху;
- правы, абавязкі і адказнасць грамадзян у галіне дарожнага руху;
- знакі дарожнага руху;
- небяспеку пажараў і ўзгаранняў, меры па папярэджанні ўзнікнення пажараў, траўматызму і гібелі людзей; дзеянні ў выпадку ўзнікнення пажару, узгарання, задымлення; правілы пажарнай бяспекі ў побыце, школе, пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, падчас навальніцы; правілы развядзення вогнішчаў;
- знакі пажарнай бяспекі;

■ правілы карыстання і захоўвання лёгкаўзгаральных рэчываў і вадкасцей;

■ першасныя сродкі пажаратушэння і іх выкарыстанне; прызначэнне пажарнай тэхнікі і абсталявання;

■ правы, абавязкі і адказнасць грамадзян у галіне пажарнай бяспекі;

■ законы, нарматыўныя і прававыя акты Рэспублікі Беларусь у галіне бяспекі жыццядзейнасці і аховы ад надзвычайных сітуацый;

■ віды надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, меры па зніжэнні іх вынікаў; асаблівасці псіхалогіі паводзін чалавека ў надзвычайных сітуацыях;

■ асноўныя мэты і задачы Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны (ГА); арганізацыю апавяшчэння і дзеянні па сігналах ГА, сучасныя сродкі масавага паражэння, абарончыя збудаванні ГА, сродкі індывідуальнай аховы; сутнасць радыяцыйнай бяспекі, спосабы і сродкі аховы ад радыёактыўных рэчываў;

■ паняцце харчовай бяспекі;

■ віды прыроднай небяспекі, правілы паводзін у гарачае і халоднае надвор'е, лекавыя і ядавітыя расліны, грыбы; правілы бяспечных паводзін у вадзе; меры бяспекі пры адносінах з жывёламі;

■ віды надзвычайных сітуацый сацыягеннага характару; правілы паводзін без дарослых дома, пры зносінах з незнаёмымі людзьмі, правілы бяспечных паводзін у школе, сітуацыях крымінагеннага характару, формы паведамлення пра небяспеку, правілы асабістых бяспечных паводзін у сям'і і грамадстве, меры процідзеяння ўцягванню ў небяспечныя дзеянні, спосабы распазнавання інфармацыі;

■ правілы бяспечных паводзін ва ўмовах вымушанага аўтаномнага існавання, меры па захаванні жыцця і здароўя.

Вучні павінны *у м е ц ь*:

■ прымаць меры па папярэджанні пажараў; ліквідаваць невялікае ўзгаранне на пачатковай стадыі; паведамляць пра пажар; выйці з палаючага ці задымленага памяшкання;

■ прымяняць атрыманыя веды пры абыходжанні з агнём, карыстанні першаснымі сродкамі пажаратушэння;

- прытрымлівацца правілаў дарожнага руху і бяспечных паводзін пешаходаў і пасажыраў; правільна паводзіць сябе падчас дарожна-транспартных здарэнняў; бяспечна паводзіць сябе на чыгунцы; аказваць простыя віды першай дапамогі; выконваць правілы дарожнага руху для вадзіцеляў мапедаў, матацыклаў, веласіпедаў;
- прымяняць веданне Правілаў дарожнага руху для забеспячэння сваёй бяспекі і бяспекі астатніх удзельнікаў дарожнага руху;
- планаваць свае паводзіны пры надзвычайных сітуацыях з улікам канкрэтных абставін і сваіх індывідуальных магчымасцей; захоўваць і абгрунтоўваць меры бяспечных паводзін у розных надзвычайных сітуацыях; прадбачыць і па магчымасці пазбягаць надзвычайных сітуацый;
- правільна дзейнічаць у экстрэмальных умовах для зніжэння адмоўных вынікаў для сябе і акружэння; аказваць першую даўрачэбную дапамогу пацярпелым у выніку надзвычайнай сітуацыі; выконваць мерапрыемствы, якія прадугледжваюць ахову насельніцтва ад надзвычайных сітуацый;
- будаваць узаемаадносіны з равеснікамі і дарослымі, пазбягаючы рызыковых паводзін, канфліктных сітуацый крыміналагеннага характару і іншых небяспечных фактараў;
- папярэджваць небяспечныя сітуацыі падчас адпачынку на прыродзе, пры адносінах з жывёламі, наведванні месцаў з масавым знаходжаннем людзей;
- захоўваць асабістую бяспеку ў сям'і і грамадстве.

Вывучэнне зместу дадзенага факультатыўнага курса падрыхтоўвае вучняў да вядзення бяспечнага ладу жыцця, дапамагае фарміраваць навыкі бяспечнай жыццядзейнасці, а таксама стварае ўмовы для падрыхтоўкі да паступлення ва ўстановы адукацыі МНС.

# II КЛАС

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

(у адпаведнасці з п.п. 3.4 п. 3 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2005 г. № 551 «Аб мерах па павышэнні бяспекі дарожнага руху»)

### 1. Падарожжа ў краіну дарожных ведаў (1 гадзіна)

Знаёмства з асноўнымі паняццямі: праезная частка, астравок бяспекі, тратуар, пешаходны пераход, падземны пешаходны пераход, пешаходная дарожка, прыпыначны пункт маршрутных транспартных сродкаў. Паказ на схеме элементаў праезнай часткі. Транспартныя сродкі (аўтобус, аўтамабіль, веласіпед, колавы трактар, мапед, матацыкл, прычэп, трамвай, тралейбус), ступень небяспекі кожнага з іх.

### 2. Дарога ў школу (1 гадзіна)

Бяспечны маршрут у школу і са школы дадому. Малюнкі індывідуальных маршрутаў, іх абмеркаванне. Патэнцыяльная небяспека для дзяцей пры іх руху па маршруце «школа—дом».

### 3. Святлафор — наш сябар і памочнік (1 гадзіна)

Віды святлафораў. Сігналы святлафора, іх прызначэнне. Правілы падпарадкавання сігналам святлафора (п. 39, 42 і дадатак 1 да Правілаў).

### 4. Надвор’е, час і дарога (1 гадзіна)

Уплыў пары года, умоў надвор’я і часу сутак на бяспеку дарожнага руху. Правілы бяспечных паводзін пры катанні на дзіцячых веласіпедах, роліках, лыжах, санках і каньках.

### 5. Знаёмства з дарожнымі знакамі (1 гадзіна)

Дарожныя знакі: «Пешаходная дарожка», «Пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход», «Надземны пешаходны пераход», «Веласіпедная дарожка», «Жылая зона», «Прыпыначны пункт» (дадатак 2 да Правілаў).

### 6. Паводзіны на прыпыначным пункце маршрутнага транспарту (1 гадзіна)

Маршрутны транспарт. Зона прыпынку. Правілы паводзін на пасадачных пляцоўках пры чаканні маршрутнага транспарту, па прыбыцці транспарту і пры яго адпраўленні. Пабочныя прадметы і бяспека руху (п. 2.25, 18.4, 23, 24 Правілаў).

### 7. Практычныя заняткі па агульных правілах пераходу праезнай часткі дарогі (1 гадзіна)

Пераход дарогі на перакрыжаванні па сігналах святлафора. Пераход дарогі ў спецыяльна абазначаных для пераходу месцах. Пераход вуліцы, дарогі па-за населеным пунктам (без святлафора і дарожнага знака «Пешаходны пераход») (п. 17, 42 Правілаў і лініі дарожнай разметкі 1.14.1—1.14.3 дадатку 3 да Правілаў).

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Агонь карысны і небяспечны (1 гадзіна)

Карысць, якую прыносіць агонь чалавеку сёння. Уменне чалавека кіраваць агнём, выкарыстоўваць яго на карысць. Шкода, якую наносіць агонь, калі выходзіць з-пад кантролю чалавека. Загадкі, прыказкі і прымаўкі на пажарную тэматыку.

### 2. Запалкі — не цацка (1 гадзіна)

Пажары, якія ўзніклі з-за гульні дзяцей з агнём. Вынікі такіх пажараў. Што трэба ведаць дзецям, каб не дапусціць пажару. Сітуацыйныя тэматычныя гульні.

### 3. Электрапрыборы (1 гадзіна)

Прыборы, якія адносяцца да электрычных. Узнікненне пажараў ад электрапрыбораў. Навыкі правільнага карыстання электрапрыборамі (уключэнне, выключэнне). Сітуацыйныя тэматычныя гульні.

### 4. Як пазбегнуць пажараў і траўмаў на кухні (1 гадзіна)

У якіх выпадках можа ўзнікнуць пажар ад газавай ці электрычнай пліты. Што можа прывесці да апёкаў. Як трэба сябе паводзіць, каб пазбегнуць апёкаў і траўмаў, асабліва на малой па плошчы кухні. Сітуацыйныя тэматычныя гульні.

### 5. Небяспечныя гульні (1 гадзіна)

Прыклады пажараў і іх вынікаў, прычынай якіх стала гульня дзяцей: кіданне запаленых папяровых самалёцікаў з балкона, самастойнае ўключэнне газавых пліт, сушка адзення і мяккіх цацак на электранагравальніках. Сітуацыйныя тэматычныя гульні.

### 6. Пажары ў дварах (1 гадзіна)

Свавольства з агнём, якое прыводзіць да ўзнікнення пажараў у дварах, яго вынікі: загаранне сухой травы, таполевага пуху; небяспека агню каля драўляных пабудоў і вогнішчаў.

### 7. Урок займальнай бяспекі (1 гадзіна)

Літаратурны або гульнявы ўрок на тэму бяспекі: чытанне літаратуры, інсцэніроўка, віктарына, тэст, прагляд відэаматэрыялаў, спаборніцтва.

## Раздзел «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Вымушаная адзінота (1 гадзіна)

Паводзіны без дарослых дома. Правілы паводзін у шматлюдных месцах, якія выключаюць магчымасць згубіцца. Адставанне ад бацькоў або іншых суправаджаючых дарослых, ад

групы падчас экскурсій, паходаў. Памяшканне, якое выпадкова зачынілася (кватэра, ліфт, дача і г. д.), формы падачы сігналаў.

#### 2. Чужыя людзі (1 гадзіна)

Правілы аховы дома ад чужых людзей. Адрас і тэлефон — асабісты сакрэт. Ключы ад дома, спосабы іх захоўвання. Паводзіны пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі на вуліцы, у транспарце, пад'ездзе, ліфце, парку.

## III КЛАС

### Раздзел «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

#### 1. Дарожная разметка ў частцы пешаходнага перахода (1 гадзіна)

Прызначэнне дарожнай разметкі. Сувязь паміж значэннем дарожнай разметкі, дарожных знакаў і сігналамі святлафораў на пешаходным пераходзе. Паўтарэнне асноўных правілаў пераходу праезнай часткі дарогі (п. 17, 39, 42, 114 Правілаў і лініі дарожнай разметкі 1.14.1—1.14.3, 1.15, 1.17.1, 1.17.2 дадатку 3 да Правілаў).

#### 2. Рухаемся па вуліцах горада (1 гадзіна)

Практычныя заняткі на спецыяльна абсталяваных пляцоўках.

#### 3. Дарожныя знакі (1 гадзіна)

Знакі, якія папярэджваюць, забараняюць, прадпісваюць, і іх прызначэнне (дарожныя знакі 3.10, 4.5.1, 4.5.2, 4.6.1, 4.6.2, 5.12—5.17, 5.22.1—5.26.2, 5.38—5.41, 6.1, 6.2, 6.6—6.15 дадатку 2 да Правілаў).

#### 4. Перакрыжаванні дарог (1 гадзіна)

Правілы руху пешаходаў праз дарогу на рэгуляваных і нерэгуляваных перакрыжаваннях. Сітуацыйныя гульні па тэме (п. 17.2, 18, 42, 50.2, 50.3, 114 Правілаў).

### 5. Зіма — небяспечная пара года (1 гадзіна)

Асаблівасці зімніх дарог. Правілы катання на санках, каньках, лыжах і бяспека дарожнага руху.

### 6. Небяспечныя сітуацыі на дарозе (1 гадзіна)

Узнікненне небяспекі для пешаходаў, якія рухаюцца па дарозе. Прычыны дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. Правы і абавязкі пешаходаў (гл. 2, гл. 4, п. 135 Правілаў).

### 7. Дарогі па-за населенымі пунктамі (1 гадзіна)

Асаблівасці пешаходнага руху па дарогах па-за населенымі пунктамі. Правілы бяспечных паводзін на дарогах у вёсцы, дачным пасёлку (п. 17—22, 131.1 Правілаў).

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Як пазбегнуць пажару ў доме (кватэры) (1 гадзіна)

Правілы пажарнай бяспекі пры карыстанні бытавой электратэхнікай, газавымі і электрычнымі плітамі.

### 2. Небяспека печаў, камінаў (1 гадзіна)

Чаму дзецям нельга самім распальваць печ, адчыняць дзверцы печы, якая паліцца, кідаць туды якія-небудзь прадметы, выграбаць вуголле. Чытанне тэматычнай літаратуры і гутарка пра прачытанае.

### 3. Небяспека свечак (1 гадзіна)

Выкарыстанне свечак для асвятлення ў выпадку неабходнасці. Запальванне свечак падчас навагодніх свят і святкавання дня нараджэння. Выкананне пры гэтым правілаў бяспекі.

### 4. Тэлефон службы выратавання — 101 (1 гадзіна)

Як паведамлялі пра пажар у тыя часы, калі не было тэлефона. Чаму менавіта гэты нумар вызначылі для выкліку дапамогі ў выпадку пажару. Чаму нельга тэлефанаваць па гэтым нумары без уважлівай прычыны. Сітуацыйная тэматычная гульня.

### 5. Прафесія — выратавальнік (1 гадзіна)

Аб'яднанне людзей у барацьбе з агнём. Першыя прафесійныя падраздзяленні пажарных. Сучасныя выратавальнікі-пажарныя. Асаблівасці іх работы. Сустрэча з супрацоўнікам падраздзялення па надзвычайных сітуацыях.

### 6. Небяспека дыму (1 гадзіна)

Небяспека задымленага памяшкання, пад'езда, ліфта. Распаўсюджванне дыму. Атрутныя рэчывы, якія выдзяляюцца пры гарэнні. Правілы засцярогі ад дыму і выхаду з задымленага памяшкання.

### 7. Урок займальнай бяспекі (1 гадзіна)

Літаратурны або гульнявы ўрок на тэму бяспекі: чытанне літаратуры, інсцэніроўка, віктарына, тэст, прагляд відэаматэрыялаў, спаборніцтва.

## Раздзел
## «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Паведамленне пра небяспеку (1 гадзіна)

Роля тэлефона ў небяспечнай сітуацыі. Варыянты выкліку хуткай дапамогі і міліцыі пры адсутнасці тэлефона. Зварот да знаёмых дарослых у розных сітуацыях. Спосабы паведамлення пра небяспеку. Навучанне навыкам паведамлення прозвішча, імя, нумара школы, апісання месца падзеі. Правільныя ўзаемаадносіны з суседзямі, прадстаўнікамі органаў аховы.

### 2. Бяспека адносін з жывёламі (1 гадзіна)

Правілы паводзін з хатнімі жывёламі. Пазбяганне траўмаў ад жывёл, птушак, насякомых (сабакі, кошкі, хамякі, каровы, коні, ваўкі, мядзведзі, змеі, пеўні, гусі, індыкі, папугаі, восы, пчолы, чмялі, кляшчы). Агрэсіўнасць і шаленства жывёл. Магчымыя вынікі падобных траўмаў. Меры засцярогі. Дзеянні ў выпадку нападзення жывёл на чалавека. Паводзіны ў выпадку атрымання траўмаў ад жывёл (інфармаванне, зварот, першая дапамога).

# IV КЛАС

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Дарога ў школу і новыя маршруты (1 гадзіна)

Раён, у якім знаходзіцца школа. Абмеркаванне канкрэтных маршрутаў вучняў, якімі яны часта карыстаюцца.

### 2. Правілы бяспечных паводзін пешаходаў і пасажыраў, якія ўдзельнічаюць у дарожным руху (1 гадзіна)

Прытрымліванне правілаў дарожнага руху пешаходамі, пасажырамі — неабходная ўмова забеспячэння бяспекі дарожнага руху. Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя МУС Рэспублікі Беларусь (п. 2.59, 4, гл. 4, гл. 5 Правілаў).

### 3. Ты — пешаход (1 гадзіна)

Асноўныя правілы бяспечных паводзін пешаходаў, якія ўдзельнічаюць у дарожным руху. Пераход дарогі па рэгуляваным і нерэгуляваным пешаходных пераходах і па-за пешаходным пераходам. Асаблівасці руху транспартных сродкаў і пешаходаў у сваім раёне (п. 17.2, 18, 36, 42, 114, 135, 50.2, 50.3 гл. 4 Правілаў).

### 4. Ты — пасажыр (1 гадзіна)

Асноўныя правілы бяспечных паводзін дзяцей-пасажыраў у маршрутным транспартным сродку пры следаванні з бацькамі, у групах і самастойна. Правілы бяспечных паводзін дзяцей-пасажыраў у легкавым аўтамабілі, на матацыкле (п. 2.44, 178, 179, 181.5—181.7, гл. 5 Правілаў).

### 5. Вадзіцель і пасажыры (1 гадзіна)

Правілы ўзаемаадносін пасажыраў і вадзіцеля. Недапушчальнасць адцягнення ўвагі вадзіцеля падчас руху. Паводзіны пасажыраў у салоне транспартнага сродку і бяспека дарожнага руху (гл. 5, гл. 23 Правілаў).

### 6. Бяспечныя паводзіны на чыгуначным транспарце (1 гадзіна)

Небяспека, якая ўзнікае падчас руху пешаходаў уздоўж чыгуначнага палатна. Чыгуначныя пераезды. Сігналы. Забарона хаджэння па чыгуначным палатне, насыпе. Забарона гульняў паблізу чыгункі. Правілы перасячэння чыгуначных шляхоў. Правілы карыстання і паводзін у чыгуначным транспарце.

### 7. Абагульняльныя гульнявыя заняткі (1 гадзіна)

Прагляд відэа- і кінафільмаў, відэаролікаў на тэму бяспекі руху. Абмеркаванне прагледжанага. Правядзенне выніковага тэста па бяспецы руху.

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Пажарная небяспека ў доме (кватэры) (1 гадзіна)

Небяспека ўзнікнення пажару ў доме (кватэры) ад агню паблізу дома, у пад’ездзе, суседняй кватэры. Правілы паводзін і меры бяспекі.

### 2. Пажарная бяспека і піратэхніка (1 гадзіна)

Забарона продажу і выкарыстання дзецьмі піратэхнічных вырабаў. Правілы супрацьпажарнай бяспекі ў сітуацыі выкарыстання піратэхнічных вырабаў. Наяўнасць інструкцыі на рускай мове, папярэджанне аб ступені небяспекі.

### 3. Прыметы загарання электраабсталявання (1 гадзіна)

Першыя прыметы няспраўнасці электраабсталявання, якія могуць стаць прычынай пажару. Дзеянні дзяцей школьнага ўзросту па папярэджанні пажару ў падобных выпадках. Сітуацыйныя тэматычныя гульні.

### 4. Небяспека гаручых і ўзгаральных вадкасцей (1 гадзіна)

Небяспечныя вадкасці, якія не толькі лёгка ўзгараюцца, але і выдзяляюць пры гарэнні атрутныя рэчывы. Асаблівая не-

бяспека памяшканняў, дзе знаходзяцца лёгкаўзгаральныя вадкасці (гаражы, павеці, балконы).

### 5. Пажаранебяспека сенасховішчаў, гарышчаў і падвальных памяшканняў (1 гадзіна)

Небяспека ўзнікнення і хуткае развіццё пажару ў месцах, дзе складзіруецца сена. Загрувашчанасць і павышаная пажарная небяспека гарышчаў і падвальных памяшканняў.

### 6. Творчы тэматычны ўрок (1 гадзіна)

Прыдумаць, намаляваць казку або фантастычнае апавяданне на пажарную тэматыку, у якой героем можа быць персанаж з папулярнага мультфільма, дзіцячага серыяла, жыхары іншых галактык або жывёлы.

### 7. Урок займальнай бяспекі (1 гадзіна)

Літаратурны або гульнявы ўрок на тэму бяспекі: чытанне літаратуры, інсцэніроўка, віктарына, тэст, прагляд відэаматэрыялаў, спаборніцтва.

## Раздзел «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Сварка з сябрамі — крыніца небяспекі (1 гадзіна)

Моўныя канфлікты і іх вырашэнне. Словы і пачуцці, спосабы іх перадачы таварышам. Недобразычлівыя паводзіны (абзыванне, замахванне, перадражніванне, кепскія і крыўдныя жарты, штурханне і г. д.) як крыніцы небяспекі і сур'ёзных канфліктаў.

Правілы аховы ад пагроз, гвалтоўных дзеянняў з боку старшакласнікаў, дарослых у школе і на вуліцы. Прыёмы распазнавання агрэсіі і недобразычлівых адносін з боку людзей рознага ўзросту (міміка, мова, рухі цела, выраз вачэй і г. д.).

Ролевыя і імітацыйныя гульні па тэме.

### 2. Правілы бяспечных паводзін у вадзе (1 гадзіна)

Небяспека вадаёмаў, асаблівасці стану вадаёмаў у розныя поры года. Правілы паводзін у вадзе: купанне і гульні ў ва-

дзе ў летні час, выкарыстанне замёрзлых вадаёмаў для катання на каньках і зімовай рыбалкі.

Спосабы пераправы праз раку (пераход уброд, пераадольванне ўплаў, масты і мосцікі, пераход па замёрзлым лёдзе), пераадольванне дрыгвы, балот.

Тонкі лёд. Прыметы небяспекі. Меры засцярогі пры руху па лёдзе вадаёмаў.

# V КЛАС

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Правілы дарожнага руху (1 гадзіна)

Гісторыя ўзнікнення правілаў дарожнага руху. Іх змяненне ў сувязі з развіццём транспартных сродкаў, дарог і грамадскіх адносін у сферы дарожнага руху. Новыя Правілы дарожнага руху, якія ўступілі ў дзеянне з 1 студзеня 2006 г. (гл. 2, 4, 5 Правілаў).

### 2. Рух вучняў групамі і ў калоне (1 гадзіна)

Парадак руху вучняў групамі па тратуары, пешаходнай і веласіпеднай дарожках, абочыне дарогі, пешаходным пераходзе, у жылой і пешаходнай зонах. Парадак руху вучняў у калоне. Правілы пасадкі групы вучняў у грамадскі маршрутны транспарт (п. 2.21, 2.48, 17, 18, 21, 22, 23.1, 24.2, 131.1, 135 Правілаў).

### 3. Правілы дарожнага руху і перакрыжаванні (1 гадзіна)

Перакрыжаванне — месца перасячэння дарог. Абазначэнне перакрыжаванняў. Правілы пераходу праезнай часткі дарогі на перакрыжаванні (п. 2.33, 2.45, 17, 18, 42 Правілаў).

### 4. Папераджальныя сігналы вадзіцеляў і жэсты рэгуліроўшчыка (2 гадзіны)

Падача вадзіцелем транспартнага сродку папераджальных сігналаў светлавымі паказальнікамі паваротаў або рукой. Сіг-

налы і жэсты рэгуліроўшчыка. Значэнне гэтых сігналаў для вадзіцеляў і пешаходаў.

Практычныя заняткі або гульня з вучнямі на дадзеную тэму (п. 35, 36, 50.2, 50.3, 56 Правілаў).

### 5. Практычныя заняткі (2 гадзіны)

Рашэнне сітуацыйных задач.

### 6. Абсталяванне транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння: спецыяльная афарбоўка, светлавая і гукавая сігналізацыя (1 гадзіна)

Транспартныя сродкі аператыўнага прызначэння: МНС, міліцыі, хуткай медыцынскай дапамогі, аварыйных службаў (газавай і камунальнай). Права пераважнага праезду і адступлення ад патрабаванняў Правілаў дарожнага руху транспартных сродкаў, якія падаюць спецыяльныя гукавыя і светлавыя сігналы (п. 2.70, 20, 29 Правілаў).

### 7. Экскурсія па горадзе, пераход праезнай часткі на перакрыжаваннях складанай канфігурацыі і ўчастка дарогі па-за перакрыжаваннем і пешаходным пераходам (2 гадзіны)

Правядзенне экскурсіі па горадзе. Назіранне за рухам транспарту і пешаходаў. Напамінанне правілаў бяспекі пры пераходзе дарогі на перакрыжаванні, па пешаходным пераходзе і па-за пешаходным пераходам (п. 17.2, 18, 42, 114, 135 Правілаў).

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Небяспека восеньскіх пажараў (1 гадзіна)

Небяспека ўзгарання сухога лісця, травы, сена. Небяспека разводзення вогнішчаў і спальвання смецця на прысядзібных і дачных участках. Недапушчальнасць выкарыстання для распальвання лёгкаўзгаральных рэчываў.

### 2. Пажарная небяспека пры ацяпленні жылых памяшканняў (2 гадзіны)

Пажарная небяспека пячнога ацяплення. Недапушчальнасць абагрэву жылых памяшканняў з дапамогай газавых і

электрычных пліт. Неабходнасць прытрымлівання правілаў пажарнай бяспекі пры карыстанні бытавымі электраабагравальнікамі, газавымі катламі.

### 3. Небяспека электрычнасці і электрапрыбораў (1 гадзіна)

У якіх выпадках электрапрыборы, разеткі і электрасеткі бываюць небяспечнымі. Дзеянні ў выпадку ўзгарання або задымлення электраправодкі або ўключаных электрапрыбораў.

### 4. Калі ўзнік пажар (2 гадзіны)

Дзеянні вучняў пры выяўленні пажару, узгарання, задымлення. Меры па папярэджанні атручвання дымам, атрымання апёкаў. Паведамленне пра пажар па тэлефоне. Выклік дапамогі пры адсутнасці тэлефона або немагчымасці ім скарыстацца.

Рашэнне сітуацыйных задач або тэматычная гульня.

### 5. Пажаранебяспечныя аб'екты — не месца для гульняў (1 гадзіна)

Небяспека пры неасцярожным абыходжанні з агнём у павецях, падвалах, гаражах, сенасховішчах, будаўнічых бытоўках, на гарышчах. Абгрунтаванасць забароны выкарыстання адкрытага агню на ўказаных аб'ектах (напрыклад, асвятленне свечкамі, запалкамі, запальнічкамі і г. д.).

### 6. Экскурсія ў падраздзяленне па надзвычайных сітуацыях (2 гадзіны)

Наведванне бліжэйшага падраздзялення па надзвычайных сітуацыях. Падрыхтоўка вучняў да экскурсіі.

### 7. Небяспека вясновых пажараў (1 гадзіна)

Небяспека ўзгарання леташняй сухой травы. Недапушчальнасць выпальвання сухой травы. Меры бяспекі пры развядзенні вогнішчаў на прысядзібных і дачных участках для спальвання сухога галля, леташніх травы і лісця, іншага смецця. Паўтарэнне правілаў бяспекі пры развядзенні вогнішчаў.

## Раздзел
## «АХОВА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ»

### 1. Месцы асаблівай небяспекі. Сустрэча з небяспечнай кампаніяй (2 гадзіны)

Месцы асаблівай небяспекі: яры, глухі лес, цёмныя алеі, закрытыя двары, будоўлі, гарышчы, падвалы, ліфты, траншэі, шалашы, лесвіцы. Небяспека, з якой там можна сутыкнуцца. Спосабы яе папярэджання. Пагрозы, іх распазнаванне. Спосабы і прыёмы аховы падчас небяспекі. Паведамленне пра здарэнне бацькам, настаўнікам.

Вымаганне, прыёмы абароны ад яго. Прыметы розных відаў махлярства і падману. Разгадванне падману па асаблівасцях паводзін людзей. Уменне супрацьстаяць падману.

### 2. Магчымасць выкрадання (1 гадзіна)

Выкраданне дзяцей і падлеткаў. Прыёмы, якія выкарыстоўваюць выкрадальнікі. Транспарт і выкраданне дзяцей. Правілы паводзін, якія дапамагаюць пазбегнуць выкрадання. Спосабы абароны і прыёмы падавання сігналаў падчас выкрадання.

### 3. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач па тэмах 1, 2.

### 4. Аварыйныя сітуацыі ў жылым доме (1 гадзіна)

Небяспечныя сітуацыі ў доме, якія звязаны з электрабытавымі прыборамі, няспраўнай электраправодкай, газавымі плітамі, сістэмай водазабеспячэння. Магчымыя вынікі аварыйных сітуацый. Меры па прадухіленні іх узнікнення. Дзейнасць пры іх узнікненні.

### 5. Электрычны ток і яго небяспека (1 гадзіна)

Небяспека электрычных правадоў і слупоў ліній электраперадач. Небяспека паражэння электрычным токам. Меры папярэджання.

### 6. Практычныя заняткі (2 гадзіны)

Рашэнне сітуацыйных задач, сітуацыйныя гульні па тэмах 4, 5.

## Раздзел
## «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Прыродная небяспека (1 гадзіна)

Лекавыя травы. Выкарыстанне лекавых раслін у народнай медыцыне. Ягады знаёмыя і незнаёмыя. Грыбы ядомыя і ядавітыя. Адрозненне ядавітых раслін. Дзеянні і першая дапамога пры атручванні ядавітымі раслінамі і грыбамі.

### 2. Правілы паводзін у спякотнае надвор'е (1 гадзіна)

Сонечныя апёкі, сонечныя і цеплавыя ўдары. Меры па іх папярэджанні. Першая дапамога пацярпелым. Правілы паводзін у спякотнае надвор'е каля вадаёмаў. Адзенне і галаўныя ўборы для спякотнага надвор'я. Смага і яе спатоленне.

### 3. Меры па папярэджанні негатыўных вынікаў пры знаходжанні на вуліцы ў моцны мароз (1 гадзіна)

Абмаражэнне, меры прафілактыкі. Адзенне і абутак для зімовага надвор'я. Меры аказання дапамогі пры абмаражэнні і пераахаладжэнні.

### 4. Меры бяспекі пры купанні і плаванні (2 гадзіны)

Правілы паводзін каля вадаёмаў. Месцы, небяспечныя для купання. Знакі, якія забараняюць.

Меры бяспекі пры плаванні і ныранні. Папярэджанне траўмаў пры плаванні, знаходжанні на беразе. Аказанне дапамогі і самадапамогі пры сутаргах.

### 5. Траўмы, іх прычыны. Меры і спосабы аказання дапамогі (1 гадзіна)

Што такое траўма. Віды траўмаў. Прычыны траўмаў. Найбольш небяспечныя месцы, дзе можна атрымаць траўму. Дамашні траўматызм. Аказанне даўрачэбнай дапамогі.

### 6. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач.

# VI КЛАС

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Дарожна-транспартныя здарэнні (2 гадзіны)

Прычыны ўзнікнення і вынікі дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ) з удзелам дзяцей. Прычыны траўміравання дзяцей пры ДТЗ. Выкананне правілаў бяспечных паводзін пры ўдзеле ў дарожным руху — залог бяспекі дарожнага руху. Дзеянні вучняў, калі яны аказаліся сведкамі або ўдзельнікамі ДТЗ (п. 2.14, 2.18, 2.43, 33, 34 Правілаў).

### 2. Сігналы святлафораў (2 гадзіны)

Віды святлафораў (пешаходныя, транспартныя, святлафоры на чыгуначным пераездзе). Значэнне сігналаў святлафораў.

Практычныя заняткі па тэме (п. 38, 39, 42, 43, 45—47 Правілаў).

### 3. Сігналы і жэсты рэгуліроўшчыка (2 гадзіны)

У якіх выпадках рух рэгулюе рэгуліроўшчык. Становішча корпуса рэгуліроўшчыка і жэсты, іх значэнне (п. 35—37 Правілаў).

Рашэнне сітуацыйных задач па правілах дарожнага руху.

### 4. Дарожныя знакі (1 гадзіна)

Прызначэнне дарожных знакаў. Пастаянныя і часовыя дарожныя знакі. Знакі, якія забараняюць, прадпісваюць, інфармацыйна-ўказальныя, знакі сервісу і дадатковай інфармацыі (дарожныя знакі 3.10, 4.5.1, 4.5.2, 4.6.1, 4.6.2, 5.12—5.17, 5.22.1—5.26.2, 5.38—5.41, 6.1, 6.2, 6.6—6.15, 7.1.1, 7.1.3, 7.1.4, 7.2.1, 7.4.7, 7.5.1—7.5.7, 7.17, 7.18, 7.23 дадатку 2 да Правілаў).

### 5. Дарожная разметка (1 гадзіна)

Прызначэнне дарожнай разметкі, яе роля ў рэгуляванні руху транспартных сродкаў і пешаходаў (п. 2.46, 2.69, 114 Правілаў і дарожная разметка 1.14.1—1.14.3, 1.15, 1.17.1, 1.17.2 дадатку 3 да Правілаў).

### 6. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач.

### 7. Віктарына (1 гадзіна)

«Ці ведаеш ты правілы бяспечных паводзін на дарогах?».

## Раздзел «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Пажары ў гісторыі чалавецтва (1 гадзіна)

Знішчэнне агнём населеных пунктаў, архітэктурных помнікаў, старажытных бібліятэк. Выкарыстанне агню ў ваенных мэтах. Найбольш буйныя пажары-катастрофы (на параходах, у месцах масавага знаходжання людзей, выбух і пажар на Чарнобыльскай АЭС).

### 2. Правілы пажарнай бяспекі для школ (2 гадзіны)

Супрацьпажарныя патрабаванні да тэрыторыі і памяшканняў школы. Планы эвакуацыі. Супрацьпажарны рэжым у кабінетах фізікі, хіміі, вытворчых майстэрнях. Меры засцярогі пры правядзенні лабараторных работ.

### 3. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Разбор сітуацыйных задач па эвакуацыі пры пажары.

### 4. Правілы пажарнай бяспекі пры арганізацыі навагодніх свят (1 гадзіна)

Пажарная бяспека пры ўпрыгожванні навагодніх ёлак, выкарыстанні ёлачных агеньчыкаў, вырабе маскарадных касцюмаў і масак, асвятленні памяшканняў, дзе праводзяцца святочныя мерапрыемствы.

### 5. Удзел членаў клубаў юных выратавальнікаў-пажарных (КЮВП) і Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных (БМГАВП) у рабоце па папярэджанні пажараў (1 гадзіна)

Мэты і задачы КЮВП і БМГАВП. Роля КЮВП і БМГАВП у справе папярэджання пажараў і выхавання моладзі.

### 6. Пажары ад навальнічных разрадаў (1 гадзіна)

Як сябе паводзіць падчас навальніцы. Меры засцярогі пры знаходжанні ў гэты час дома, на вуліцы, у лесе, каля вадаёма, падчас працы ў полі, на лузе.

### 7. Конкурс знаўцаў пажарнай справы (2 гадзіны)

Тэматычная спартыўна-забаўляльная гульня.

### 8. Практычныя заняткі па правядзенні эвакуацыі са школы (1 гадзіна)

Адпрацоўка практычных навыкаў па бяспечнай эвакуацыі з класа, з памяшкання школы пры ўзнікненні пажару. Разгледжанне розных варыянтаў: вучні знаходзяцца ў класе, у спартыўнай або актавай зале, у фае падчас перапынку.

## Раздзел «АХОВА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ»

### 1. Правілы бяспечных паводзін у школе (2 гадзіны)

Правілы паводзін у калідорах, рэкрэацыях, гардэробных памяшканнях, залах, прадметных кабінетах. Веданне плана школы, выхадаў з яе ў выпадку небяспекі. Лесвічныя маршы — месцы павышанай небяспекі.

Незнаёмыя прадметы на тэрыторыі школы. Правілы інфармавання пра іх. Рэчы свае і чужыя. Адказнасць за захоўванне сваіх і чужых рэчаў. Функцыі вахцёра і сакратара школы.

### 2. Канфлікты ў класе, на вуліцы і дома як шлях да небяспекі (1 гадзіна)

Узаемаадносіны з роднымі, блізкімі, таварышамі. Небяспека захаплення самалюбаваннем. Небяспека выкарыстання памылковых ацэнак у паводзінах адзін аднаго. Правілы паводзін у класным калектыве як шлях пазбягання канфліктаў. Давер бацькам, настаўніку як асноўны шлях прадухілення небяспекі канфлікту.

Прыметы агрэсіі з боку равеснікаў. Пагрозы, правілы абароны ад іх. Прыёмы супрацьстаяння спробам схілення да курэння, ужывання спіртных напіткаў. Прыёмы супраціўлення старэйшым па ўзросце пры спробах уцягвання ў проціпраўныя дзеянні.

### 3. Небяспека галалёду (1 гадзіна)

Галалёд як небяспечная з'ява прыроды. Павышаная небяспека атрымання траўмаў у галалёд. Меры бяспекі па папярэджанні негатыўных вынікаў пры руху на слізкіх участках дарогі або тратуара.

### 4. Надзвычайныя сітуацыі, звязаныя з воднай стыхіяй (1 гадзіна)

Паводкі, затапленні, падтапленні ў час паводкі або моцных ліўняў і іх магчымыя вынікі. Дзеянні па забеспячэнні бяспекі або выратаванні з небяспечных зон.

### 5. Буры, ураганы і моцныя ветры (1 гадзіна)

Буры, ураганы і моцныя ветры як небяспечныя з'явы прыроды. Іх магчымыя вынікі. Меры бяспечных паводзін на вуліцы ў час буры або моцнага ветру. Дзеянні ў выпадку атрымання папярэджання пра гэтыя прыродныя з'явы.

### 6. Небяспека маланкі ў час навальніцы (1 гадзіна)

Маланкавы разрад, яго характарыстыка і небяспека. Месцы, найбольш небяспечныя ў час навальніцы, і прадметы, у якія часцей за ўсё трапляюць разрады маланкі. Меры бяспекі ў час навальніцы.

### 7. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач, сітуацыйныя гульні па тэмах раздзела.

## Раздзел
## «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Лад жыцця і ахова здароўя (2 гадзіны)

Надвор'е, мода і здароўе. Харчаванне і здароўе. Фізічная культура і разумнае загартоўванне. Асабістая гігіена — шлях

да здароўя. Воля і звычкі. Супрацьстаянне ўцягванню ў шкодныя звычкі. Шкода курэння і алкаголю. Небяспека празмерных захапленняў і забаў.

### 2. Інфармацыя бывае розная (1 гадзіна)

Тэлевізар, відэа і рэклама, іх значэнне ў жыцці чалавека. Іх пазітыўны і негатыўны ўплыў. Набыццё вопыту распазнавання небяспечных жыццёвых сітуацый пры праглядзе. Прыгожыя і агідныя, трагічныя і камічныя сцэны на экране. Набыццё ўмення крытычна адносіцца да інфармацыі. Роля ўласнай ацэнкі і ацэнак дарослых у адносінах да прагляду падобнай інфармацыі.

### 3. Небяспечная флора і фаўна нашага раёна, горада, мясцовасці (1 гадзіна)

Віды небяспечных раслін. Небяспечныя насякомыя. Хваробы, якія перадаюцца насякомымі. Дзікія жывёлы ў вашай мясцовасці, асаблівасці іх пражывання.

### 4. Бяспечныя паводзіны каля вадаёмаў (2 гадзіны)

Вадаёмы ў вашым горадзе (або ў сельскай мясцовасці). Небяспечныя гульні каля вадаёмаў. Паводзіны на набярэжных. Прыёмы выратавання на вадзе. Аказанне даўрачэбнай дапамогі.

### 5. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач, сітуацыйныя гульні.

## VII КЛАС

### Раздзел «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Рух транспартных сродкаў (1 гадзіна)

Хуткасць руху транспартных сродкаў. Шлях спынення транспартных сродкаў. Час, неабходны для спынення транспартнага сродку. Бяспечная адлегласць ад пешахода да транспарт-

нага сродку для пераходу дарогі ў розных умовах надвор'я (дождж, снег, галалёд, лістапад).

### 2. Рух пешаходаў па абочыне і праезнай частцы дарогі ў светлы і цёмны час сутак (1 гадзіна)

Роля сігнальных ліхтароў і святловяртальнікаў для транспартных сродкаў і пешаходаў. Рух пешаходаў, якія вядуць у руках веласіпед, мапед, матацыкл (п. 17.1—17.3, 19 Правілаў).

### 3. Правілы дарожнага руху для вадзіцеляў мапедаў, матацыклаў, веласіпедыстаў (2 гадзіны)

Патрабаванні да тэхнічнага стану і знешняга выгляду веласіпеда, мапеда, матацыкла. Патрабаванні Правілаў дарожнага руху, якімі павінны кіравацца вадзіцелі мапедаў, матацыклаў, веласіпедаў. Узроставы цэнз. Размяшчэнне веласіпедаў і мапедаў на дарозе. Парадак руху груп веласіпедыстаў, матацыклістаў. Небяспека неарганізаваных спаборніцтваў у хуткасці (гл. 20 Правілаў).

### 4. Правілы перавозкі пасажыраў на веласіпедах, матацыклах (1 гадзіна)

Экіпіроўка пры яздзе на матацыкле, абавязковае выкарыстанне засцерагальных шлемаў. Правілы паводзін пасажыра матацыкла. Дапушчальная колькасць пасажыраў. Абмежаванні, прадугледжаныя Правіламі для перавозкі пасажыраў на матацыклах, мапедах, веласіпедах (п. 2.27, 2.28, 9.5, 23.2, 153 Правілаў).

### 5. Рух у жылой і пешаходнай зонах (1 гадзіна)

Правілы руху пешаходаў і транспартных сродкаў на дваровых тэрыторыях, абазначаных знакамі «Жылая зона», «Пешаходная зона» (гл. 18 і дарожныя знакі 5.38—5.41 дадатку 2 да Правілаў).

### 6. Практычныя заняткі (4 гадзіны)

Рашэнне сітуацыйных задач па Правілах дарожнага руху, прагляд і абмеркаванне відэаролікаў, камп'ютарныя гульні.

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Пажарная бяспека пры правядзенні масавых мерапрыемстваў (2 гадзіны)

Неабходнасць прытрымлівання правілаў пажарнай бяспекі пры правядзенні мерапрыемстваў (вечар адпачынку) або наведванні аб'ектаў з масавым знаходжаннем людзей (дыскатэка, кінатэатр, магазін і г. д.). Дзеянні падчас узнікнення пажару на ўказаных аб'ектах.

### 2. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач па правілах бяспекі пры правядзенні масавых мерапрыемстваў і дзеянням у выпадку ўзнікнення пажару.

### 3. Знакі пажарнай бяспекі (1 гадзіна)

Знакі, якія папярэджваюць, прадпісваюць, забараняюць, указальныя знакі бяспекі. Прыклады іх прымянення і месцы ўстаноўкі.

### 4. Я б у выратавальнікі пайшоў (2 гадзіны)

Прафесія — выратавальнік. Установы адукацыі МНС Рэспублікі Беларусь. Патрабаванні да абітурыентаў. Знаёмства з прафесіяй у дзень адчыненых дзвярэй у Камандна-інжынерным інстытуце МНС Рэспублікі Беларусь.

### 5. Небяспека лясных пажараў (1 гадзіна)

Прычыны лясных пажараў: незатушаныя вогнішчы, запалкі, акуркі, маланка. Распаўсюджванне агню і меры барацьбы з ім. Матэрыяльны і экалагічны ўрон.

### 6. Правілы распальвання вогнішчаў (1 гадзіна)

Выбар і падрыхтоўка месца для вогнішча ў паходзе: расчышчэнне месца, назапашванне паліва, улік хуткасці і напрамку ветру. Дзяжурства каля вогнішча. Тушэнне вогнішча. Забарона распальвання вогнішчаў у сухое надвор'е. Дзеянні падчас узгарання сухой травы або вецця.

### 7. Практычныя заняткі па правілах распальвання вогнішчаў (2 гадзіны)

Спосабы складвання дроў для вогнішча. Як скласці вогнішча ў ветранае надвор'е, на мокрай зямлі, снезе. Як патушыць вогнішча, каб яно не стала прычынай пажару.

## Раздзел «АХОВА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ»

### 1. Правілы бяспечных паводзін у сітуацыях крымінагеннага характару (2 гадзіны)

Месцы павышанай крымінагеннай небяспекі: кірмашы, стадыёны, вакзалы і г. д. Сітуацыі сустрэчы з гвалтаўнікамі і хуліганамі на вуліцы, у грамадскіх месцах, транспарце, пад'ездзе дома, ліфце. Самаацэнка паводзін. Псіхалагічныя і фізічныя прыёмы самаабароны. Адказнасць непаўналетніх за паводзіны ў грамадскіх месцах. Дакладнае інфармаванне дарослых аб канкрэтных сітуацыях крымінагеннага характару. Прычыны, па якіх трапляюць у сітуацыю ахвяры (даверлівасць, балбатлівасць, хвальба).

Паводзіны пры навязванні знаёмства. Паводзіны пры ўзнікненні канфліктаў паміж людзьмі, боек. Адмова ад прапаноў падазроных людзей.

### 2. Вымушанае аўтаномнае існаванне (2 гадзіны)

Аўтаномнае існаванне чалавека або групы людзей. Прычыны, па якіх трапляюць ва ўмовы вымушанага аўтаномнага існавання (аварыя транспартнага сродку далёка ад населеных пунктаў, заблудзіліся ў лесе, адсталі ад групы ў турпаходзе і інш.).

Правілы бяспечных паводзін у аўтаномных умовах: арыентаванне на мясцовасці, выхад да населеных пунктаў, уладкаванне часовага прытулку, спосабы здабычы агню, забеспячэнне вадой і харчаваннем, сігналы бедства, пераадоленне страху. Практычныя заданні па адпрацоўцы навыку ўкрыцця ў сховішча.

Вызначэнне лідэра, размеркаванне абавязкаў, сумеснае абмеркаванне выйсця, узаемадапамога і ўважлівасць адзін да аднаго.

### 3. Паводкі. Правілы паводзін і абароны пасля папярэджання і ў час паводкі (1 гадзіна)

Паводка як стыхійнае бедства, яго прычыны. Меры бяспекі пасля папярэджання. Падрыхтоўка да магчымай эвакуацыі. Правілы бяспекі ў час паводкі.

### 4. Экалогія і бяспека (1 гадзіна)

Сувязь паміж экалогіяй і бяспекай людзей. Экалагічныя катастрофы. Экалагічныя асаблівасці населенага пункта, дзе размешчана школа: наяўнасць лясоў, рэк, прамысловых і сельскагаспадарчых аб'ектаў і іх уплыў на экалогію. Меры аховы навакольнага асяроддзя.

### 5. Экскурсія «Экалогія нашага краю» (2 гадзіны)

Паездка па горадзе ці пешая прагулка, у час якой вучням даецца магчымасць вывучыць навакольнае асяроддзе вакол прампрадпрыемстваў або вуліц з інтэнсіўным рухам аўтамабіляў, парку або лесу.

## Раздзел «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Небяспечныя звычкі (2 гадзіны)

Шкодныя звычкі, іх уплыў на здароўе. Тытунекурэнне і яго ўплыў на арганізм, на здароўе дзяцей і навакольных людзей. Алкаголь, яго ўплыў на здароўе і паводзіны чалавека, сацыяльныя вынікі ўжывання алкаголю, зніжэнне разумовай і фізічнай працаздольнасці. Наркотык — вораг чалавека. Наркаманія і таксікаманія: агульныя паняцці.

### 2. Камп'ютар і асабістая бяспека (2 гадзіны)

Камп'ютар і фізічнае здароўе чалавека. Камп'ютарныя гульні, правілы іх адбору па змесце. Неліцэнзійная прадукцыя, адказнасць за яе набыццё. Адказнасць за несанкцыянаваны доступ у інтэрнет. Адносіны да інфармацыі гвалтоўнага, крымінальнага, антычалавечнага характару, асабістая псіхалагічная і духоўная абарона чалавека.

### 3. Ахова фізічнага і псіхалагічнага здароўя на вуліцах горада, пасёлка, на двары свайго дома (1 гадзіна)

Абарона ад нападзення ў пад'ездзе, у ліфце. Правілы паводзін пры абароне. Спосабы і прыёмы абароны цела. Сігналы аб небяспецы. Формы супраціўлення. Абарона ад нападзення на вуліцы. Уважлівасць і асцярожнасць пры сустрэчы з небяспекай або пагрозай жыццю і здароўю на вуліцы.

Прыёмы псіхалагічнага ціску, уцягвання ў небяспечныя сітуацыі і спосабы іх нейтралізацыі. Што такое нейралінгвістычнае праграміраванне. Небяспека, звязаная з уздзеяннем слоў. Небяспека ўцягвання ў секты і іншыя процізаконныя аб'яднанні. Віды махлярства і меры бяспекі пры сустрэчы з махлярамі.

### 4. Бяспечны адпачынак на прыродзе (1 гадзіна)

Папярэджанне траўматызму ў месцах адпачынку (у лесе, на вадаёмах, на дачы, у лагеры). Небяспека траўматызму пры купанні. Прафілактыка няшчасных выпадкаў пры пераходзе па мастах, бярвеннях, камянях. Бяспека абыходжання з рэчамі ў адпачынку.

Папярэджанне канфліктных сітуацый у час адпачынку.

### 5. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач па тэмах раздзела.

## VIII КЛАС

### Раздзел «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Гутарка «Праверка ведання правілаў дарожнага руху» (1 гадзіна)

Паўтарэнне правілаў дарожнага руху ў аб'ёме VII класа (п. 2.27, 2.28, 9.5, 17.1—17.3, 19, 23.2, 153, гл. 18, гл. 20 Правілаў і дарожныя знакі 5.38—5.41 дадатку 2 да Правілаў).

### 2. Паводзіны вучняў пры дарожна-транспартным здарэнні (1 гадзіна)

Паводзіны ўдзельнікаў і сведкаў дарожна-транспартнага здарэння. Забеспячэнне ўласнай бяспекі пасля ДТЗ. Выклік хуткай дапамогі, міліцыі, падраздзялення МНС (п. 2.18, 2.43, 31—33 Правілаў).

### 3. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пацярпелым пры дарожна-транспартным здарэнні (2 гадзіны)

Дзеянні па аказанні дапамогі пацярпелым. Практычныя заняткі па аказанні першай даўрачэбнай дапамогі (пад кіраўніцтвам медыцынскага работніка).

### 4. Чыгуначныя пераезды (1 гадзіна)

Правілы пераходу чыгуначных пераездаў пешаходамі. Правілы паводзін пасажыраў падчас вымушанага прыпынку транспартнага сродку на чыгуначным пераездзе. Дарожныя знакі і сігналы святлафораў на чыгуначных пераездах. Іх значэнне. Правілы бяспекі пры руху людзей уздоўж чыгуначнага палатна. Правілы пераходу праз чыгуначныя пуці па-за чыгуначным пераездам (п. 2.19, 2.20, 39.5, 46, 128.3, 130 Правілаў і дарожныя знакі 1.1—1.4.6 дадатку 2 да Правілаў).

### 5. Дарожны рух па-за населенымі пунктамі (1 гадзіна)

Трактары і прычэпы (прычапныя і навясныя прылады да іх). Самаходныя сельскагаспадарчыя машыны. Гужавыя транспартныя сродкі. Прагон жывёлы. Патрабаванні да бяспекі дарожнага руху гужавых транспартных сродкаў і прагону жывёлы (п. 2.8, 3.13, 2.22, 2.60, 131.1, 181.1—181.3, гл. 21 Правілаў).

### 6. Грамадскі транспарт (2 гадзіны)

Маршрутныя транспартныя сродкі. Неабходнасць прытрымлівання правілаў бяспекі пры пасадцы, высадцы пасажыраў у маршрутным транспартным сродку і пераходзе вуліцы пешаходамі, якія выйшлі з маршрутнага транспартнага сродку. Правілы бяспечных паводзін у метро (п. 2.25, 23, 24, 179, 181.3 Правілаў). Узаемаадносіны «вадзіцель—пешаход» і «пешаход—вадзіцель». Выпадкі адсутнасці павагі паміж удзельнікамі да-

рожнага руху. Спосабы пазбягання канфліктаў у дарожных сітуацыях паміж удзельнікамі дарожнага руху і ў салоне транспартнага сродку. Паводзіны вучняў пры пасадцы, высадцы, чаканні маршрутнага транспартнага сродку.

### 7. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач, сітуацыйныя гульні.

### 8. Абагульняльныя заняткі (1 гадзіна)

Правядзенне віктарыны (конкурсу) на веданне правілаў дарожнага руху (п. 2.8, 2.18, 2.19, 2.20, 2.22, 2.25, 2.43, 2.60, 23, 24, 31—33, 39.5, 46, 128.3, 130, 131.1, 179, 181.1—181.3, гл. 21 Правілаў і дарожныя знакі 1.1—1.4.6 дадатку 2 да Правілаў).

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Асновы гарэння. Пажарная небяспека рэчываў і матэрыялаў (1 гадзіна)

Асновы гарэння. Цвёрдыя гаручыя рэчывы і матэрыялы. Самаўзгаранне рэчываў. Лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці. Запальванне і самазапальванне вадкасцей. Узрыва- і пажаранебяспечныя пара- і газапаветраныя сумесі. Пажаранебяспека драўнянага і мучнога пылу.

### 2. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Правядзенне настаўнікам доследаў, якія дэманструюць хуткасць узгарання рэчываў і матэрыялаў (лёгкаўзгаральных і цяжкаўзгаральных).

Рашэнне сітуацыйных задач па бяспецы пры захоўванні і абыходжанні з лёгкаўзгаральнымі рэчывамі і матэрыяламі.

### 3. Першасныя сродкі пажаратушэння (2 гадзіны)

Шчыты з наборам пажарнага інвентару. Вогнетушыцелі. Месцы іх устаноўкі. Прызначэнне, віды, правілы захоўвання і парадак прымянення вогнетушыцеляў. Выкарыстанне ў мэтах тушэння вады, пяску, зямлі, снегу, кашмы, сырых галінак. Пажарныя краны.

### 4. Пажарная тэхніка і абсталяванне (2 гадзіны)

Маркі і прызначэнне пажарных аўтамабіляў (аўтацыстэрна, аўтанасос, аўтамашына сувязі і асвятлення і г. д.), кароткая характарыстыка магчымасцей пажарнай тэхнікі. Мотапомпа як сродак падачы вады на пажары. Пажарна-тэхнічнае ўзбраенне, яго прызначэнне. Баявое адзенне, амуніцыя і сродкі аховы органаў дыхання пажарных.

### 5. Сістэмы аўтаматычнага пажаратушэння (1 гадзіна)

Аўтаматызаваная пажарная сігналізацыя. Аўтаномныя і цэнтралізаваныя сістэмы сігналізацыі. Віды пажарных апавяшчальнікаў. Устаноўкі пажаратушэння. Сістэмы дымавыдалення.

### 6. Эвакуацыя, выратаванне і самавыратаванне (2 гадзіны)

Эвакуацыя са шматпавярховых будынкаў, месцаў з масавым знаходжаннем людзей. Выратаванне з палаючай кватэры, жылога дома, гарышча, падвала, задымленага пад’езда, лесу, які гарыць. Дапамога ў выратаванні людзей і жывёл.

Прагляд і аналіз хранікальных матэрыялаў, падабраных са сродкаў масавай інфармацыі. Складанне плана эвакуацыі са сваёй кватэры (пакоя). Практычная эвакуацыя з класа (школы).

### 7. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Адпрацоўка практычных навыкаў па спасенні і самаспасенні пры пажары.

## Раздзел «АХОВА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ»

### 1. Радыяцыя і жыццё (1 гадзіна)

Агульныя звесткі пра радыяцыю. Прыродны радыяцыйны фон. Атамная энергія, яе стваральнае і разбуральнае ўздзеянне. Аварыя на ЧАЭС — найбуйнейшая катастрофа ў гісторыі чалавецтва. Прычыны аварыі. Меры па ліквідацыі катастрофы. Подзвіг пажарных. Доўгатэрміновыя вынікі катастрофы для жыхароў Беларусі, Еўропы.

Першыя сутыкненні вучоных з паражальным уздзеяннем радыяцыі на арганізм чалавека. Знешняе і ўнутранае абпра-

меньванне. Залежнасць ступені знешняга абпраменьвання ад часу знаходжання ў забруджанай зоне, адлегласці ад крыніцы выпраменьвання, наяўнасці ахоўных матэрыялаў. Спосабы і сродкі аховы ад радыеактыўных рэчываў. Ахоўнае адзенне і сродкі аховы органаў дыхання. Дэзактывацыя. Укрыццё ў сховішчах. Эвакуацыя. Забеспячэнне экалагічна чыстымі прадуктамі харчавання і пітной вадой.

### 2. Харчовая бяспека і ахова здароўя (1 гадзіна)

Паняцце харчовай бяспекі. Вытворчасць экалагічна чыстых прадуктаў. Выбар прадуктаў харчавання пасля вывучэння інфармацыі пра іх. Рэклама прадуктаў і бяспека здароўя. Уменне вывучаць інструкцыі на ўпакоўках. Прыгатаванне ежы і экалагічная бяспека чалавека. Генетычна мадыфікаваныя прадукты харчавання. Біялагічна актыўныя дабаўкі, адносіны да іх. Спосабы вывядзення радыенуклідаў з арганізма. Уключэнне ў рацыён харчавання прадуктаў, якія спрыяюць вывядзенню радыенуклідаў і павышаюць устойлівасць арганізма да радыяцыі.

### 3. Надзвычайныя сітуацыі прыроднага характару (1 гадзіна)

Класіфікацыя надзвычайных сітуацый (НС) прыроднага характару. Надзвычайныя сітуацыі прыроднага паходжання, характэрныя для рэспублікі: ураганы, снежныя буры і заносы, навадненні (разводдзе, паводка), лясныя пажары, пажары на тарфяных месцараджэннях, навальнічныя ліўні. Магчымыя вынікі НС прыроднага характару. Правілы паводзін пры пагрозе і ўзнікненні НС прыроднага характару. Неабходнасць вывучэння клімату і магчымых прыродных НС перад выездам на адпачынак у краіны блізкага і далёкага замежжа.

### 4. Спосабы і сродкі аховы пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый прыроднага характару (2 гадзіны)

Дзеянні чалавека, які апынуўся ў зоне НС прыроднага характару (навадненне, снежная бура, ураган, лясны пажар, эпідэмія). Спосабы і сродкі аховы. Прыняцце мер па папярэджанні непажаданых вынікаў. Аказанне дапамогі пацярпелым. Ака-

занне даўрачэбнай медыцынскай дапамогі пацярпелым (пры абмаражэнні, апёку і г. д.).

Спосабы апрацоўкі ран, меры антысептыкі. Дапамога пры атручэннях, апёках, крывацёках. Віды і спосабы перамяшчэння пацярпелых. Траўмы галавы і пазваночніка. Першая дапамога тапельцу. Штучнае дыханне. Непрамы масаж сэрца. Індывідуальная аптэчка, правілы карыстання. Прыёмы і сродкі медыцынскай дапамогі ва ўмовах школы, на вуліцы, дома, у грамадскіх месцах, на транспарце.

### **5. Небяспека эпідэмій і масавых атручэнняў** (1 гадзіна)

Асабліва небяспечныя інфекцыйныя захворванні людзей: чума, халера, СНІД, дыфтэрыя, дызентэрыя, вірусны гепатыт і г. д. Асабліва небяспечныя для людзей інфекцыйныя захворванні жывёл. Шаленства. Масавае атручэнне прадуктамі харчавання і пітной вадой. Меры прафілактыкі.

### **6. Надзвычайныя сітуацыі крымінагеннага характару** (1 гадзіна)

Адказнасць за злачынствы супраць грамадскага парадку і грамадскай маральнасці (хуліганства, непраўдзівае паведамленне пра небяспеку, апаганьванне помнікаў і магіл, распаўсюджванне парнаграфіі). Правілы паводзін і спосабы самаабароны ад розных відаў нападзення на чалавека. Схіленне да ўгону аўтатранспарту, спосабы ўхілення ад удзелу. Сутыкненне груп. Метады і прыёмы прадухілення злачынства. Крымінальная адказнасць за крадзеж асабістай і грамадскай маёмасці. Адказнасць за непраўдзівае сведчанне.

Надзвычайныя сітуацыі крымінагеннага характару падчас масавых свят, гулянняў, спартыўных і іншых відовішчаў, меры прадухілення і выхаду з сітуацыі.

### **7. Адказнасць за правапарушэнні** (1 гадзіна)

Віды правапарушэнняў у падлеткавым асяроддзі. Прычыны правапарушэнняў. Правапарушэнні і канфлікты. Сітуацыі ўцягвання ў проціпраўную дзейнасць з боку дарослых. Правапарушэнне і адказнасць. Камісія па справах непаўналетніх. Лідэры сапраўдныя і несапраўдныя. Адказнасць за гру-

павыя антыграмадскія дзеянні. Узроставы цэнз за правапарушэнні. Крымінальны кодэкс (агульнае паняцце).

### **8. Прававая ахова дзяцей і падлеткаў** (1 гадзіна)

Бацькі як законныя прадстаўнікі інтарэсаў дзяцей і падлеткаў у складаных жыццёвых сітуацыях. Роля адміністрацыі школы ў ахове інтарэсаў дзяцей і падлеткаў падчас следства і ў судзе. Спосабы інфармавання бацькоў і педагогаў падчас крадзяжоў, боек, пагроз, вымагання, гвалтоўных дзеянняў. Нядобранадзейныя або небяспечныя сітуацыі ў сям'і і прававая ахова непаўналетніх.

### **9. Моладзь супраць тэрарызму** (1 гадзіна)

Тэрарызм як небяспечная з'ява. Меры, якія прымае дзяржава для папярэджання тэрактаў. Меры пры выяўленні падазроных прадметаў або падазроных дзеянняў людзей.

## Раздзел
## «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### **1. Наркотык смяротны** (1 гадзіна)

Уздзеянне таксічных і наркатычных рэчываў на чалавека. Сацыяльныя вынікі далучэння чалавека да ўжывання наркотыкаў. Трагічны зыход жыцця людзей у выніку наркаманіі і таксікаманіі. Крымінальная адказнасць за выраб, захаванне і збыт наркотыкаў. Формы і прыёмы супраціўлення ўцягванню ва ўжыванне наркатычных сродкаў. Хуткасць і форма паведамлення пра сітуацыі, звязаныя з наркотыкамі, дарослым. Спосабы пераадолення стрэсавага стану, няўдач у вучобе, асабістым жыцці, пошукі выйсця з экстрэмальных сітуацый. Дапамога сабе і таварышу. Роля бацькоў, педагогаў, псіхолагаў у прадухіленні небяспекі ўжывання наркотыкаў.

### **2. Здароўе і каштоўнасць жыцця** (1 гадзіна)

Псіхалагічнае здароўе, яго асноўныя характарыстыкі. Прыметы дыскамфорту, самааналіз яго прычын. Узаемасувязь фізічнага, псіхічнага і духоўнага стану чалавека. Трэніроўка пачуццяў, упраўленне імі. Небяспечныя думкі і пачуцці. Жыццё

як дар і каштоўнасць. Спосабы дапамогі і самадапамогі ў выпадках пагрозы самагубства або меркавання пра яго.

### 3. Сям'ю абараняюць усе (1 гадзіна)

Узаемаадносіны з бацькамі, прычыны несупадзення поглядаў, густаў, ацэнак. Сям'я і грошы. Міф пра ўсемагутнасць грошай. Грошы і праца. Псіхалагічныя прыёмы аховы ад інфармацыі, якая наносіць шкоду сям'і. Непрыемнасці, сваркі ў сям'і, правілы паводзін у падобных сітуацыях. Паводзіны дзяцей і дабрабыт сям'і. Пераадольванне стрэсу, страху, дэпрэсіі. Адрасы звароту па дапамогу.

### 4. Асабістая бяспека і калектыў (1 гадзіна)

Небяспека канфліктаў, якія вынікаюць з супрацьпастаўлення груповак класа. Канфлікты і спосабы іх вырашэння. Гендэрныя адрозненні і канфлікты. Сяброўскія ўзаемаадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак у класе, школе, двары і мікраараёне — залог бяспекі кожнага. Чужая кампанія, спосабы распазнавання непрыязных дзеянняў. Магчымасці калектыву ў абароне кожнага свайго члена. Небяспека групавой змовы. Грамадская думка калектыва і абарона асобы.

### 5. Правілы бяспечных паводзін на вадаёмах (1 гадзіна)

Меры прафілактыкі няшчасных выпадкаў на вадаёмах. Прыёмы аказання дапамогі пры траўматызме. Спосабы выратавання тапельцаў. Меры аказання даўрачэбнай дапамогі.

## IX КЛАС

### Раздзел «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ»

### 1. Гутарка «Праверка ведання правілаў дарожнага руху» (1 гадзіна)

Паўтарэнне Правілаў дарожнага руху ў аб'ёме VIII класа (п. 2.8, 2.18, 2.19, 2.20, 2.22, 2.25, 2.43, 2.60, 23, 24, 31—33, 39.5, 46, 128.3, 130, 131.1, 179, 181.1—181.3, гл. 21 Правілаў і дарожныя знакі 1.1—1.4.6 дадатку 2 да Правілаў).

### 2. Правілы карыстання транспартнымі сродкамі (2 гадзіны)

Права на кіраванне матацыклам, аўтамабілем. Удзел у дарожным руху ў якасці пасажыра легкавога аўтамабіля, грузавога аўтамабіля, аўтобуса, трамвая, тралейбуса, матацыкла. Дзеянні пасажыра ў перадаварыйнай сітуацыі (п. 6, 7.2—7.5, 190, гл. 5, гл. 23 Правілаў). Узроставыя і медыцынскія абмежаванні на кіраванне некаторымі відамі транспартных сродкаў. Прычыны абмежаванняў. Допуск да кіравання транспартным сродкам. Падрыхтоўка вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, у прыватнасці вадзіцеляў матацыклаў. Патрабаванні правілаў дарожнага руху ў адносінах да вадзіцеля і пасажыра матацыкла.

### 3. Неабходнасць прытрымлівання правілаў бяспечных паводзін удзельнікамі дарожнага руху (2 гадзіны)

Адміністрацыйная адказнасць за парушэнні Правілаў дарожнага руху. Асабісты прыклад прытрымлівання правілаў бяспечных паводзін — залог забеспячэння бяспекі дарожнага руху. Роля дзяржавы ў забеспячэнні бяспекі ўдзельнікаў дарожнага руху. ДАІ — орган дзяржаўнага кантролю ў сферы забеспячэння бяспекі дарожнага руху (гл. 2, 4, 5 Правілаў).

Абавязкі пешаходаў і пасажыраў па выкананні патрабаванняў Правілаў дарожнага руху. Прафілактыка дарожнатранспартных здарэнняў. Сустрэча з супрацоўнікам ДАІ (п. 2.59, 4.5, 7, гл. 4, гл. 5 Правілаў).

### 4. Аказанне першай даўрачэбнай дапамогі пацярпелым пры дарожна-транспартным здарэнні (2 гадзіны)

Магчымасць і дапушчальнасць аказання першай даўрачэбнай дапамогі. Практычныя навыкі па аказанні пацярпелым першай даўрачэбнай дапамогі (пад кіраўніцтвам медыцынскага работніка).

### 5. Парадак атрымання вадзіцельскага пасведчання (1 гадзіна)

Умовы, неабходныя для атрымання вадзіцельскага пасведчання: узроставы цэнз, медыцынскія патрабаванні для допуску да кіравання механічным транспартным сродкам, падрыхтоўка вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў.

### 6. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Рашэнне сітуацыйных задач. Сітуацыйныя гульні.

### 7. Выніковыя заняткі (1 гадзіна)

Паўтарэнне правілаў дарожнага руху ў аб'ёме IX класа (п. 2.59, 4.5, 6, 7, 190, гл. 4, гл. 5, гл. 23 Правілаў). Праверка ведання вучнямі Правілаў дарожнага руху, навыкаў бяспечных паводзін на дарогах. Самастойная работа вучняў над карткамі з задачамі (ці тэстамі).

## Раздзел
## «ПРАВІЛЫ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ»

### 1. Неабходнасць выканання супрацьпажарных патрабаванняў (1 гадзіна)

Прыклады пажараў з трагічнымі вынікамі і прычыненнем вялікага матэрыяльнага ўрону з-за парушэння або невыканання правілаў пажарнай бяспекі і патрабаванняў работнікаў дзяржаўнага пажарнага надзору.

### 2. Неасцярожнасць пры курэнні — асноўная прычына гібелі людзей пры пажарах (1 гадзіна)

Статыстыка гібелі людзей пры пажарах, працэнт гібелі з-за неасцярожнасці пры курэнні. Уплыў алкагольнага ап'янення на ўзнікненне і трагічны зыход падобных пажараў.

### 3. Дзеянні падчас пажару (2 гадзіны)

Магчымасць ліквідацыі ўзгарання першаснымі сродкамі. Выклік прафесіянальных падраздзяленняў падчас пажару. Апавяшчэнне людзей, якія знаходзяцца ў небяспечнай зоне. Меры засцярогі ад паражэння электрычным токам, атрымання апёкаў, атручвання дымам, газам.

### 4. Псіхалогія паводзін чалавека пры пажары (1 гадзіна)

Псіхалагічная падрыхтоўка чалавека да дзеянняў у экстрэмальных умовах пажару: уменне ацэньваць рэальную небяспеку і дзейнічаць згодна з абставінамі. Паніка. Небяспека натоўпу.

### 5. Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Адпрацоўка практычных навыкаў па дзеяннях у выпадку пажару.

### 6. Правілы пажарнай бяспекі пры паездцы ў лясы і іншыя месцы для адпачынку (3 гадзіны)

Неабходнасць прытрымлівання правілаў пажарнай бяспекі ў лясах, каля вадаёмаў і ў іншых месцах для адпачынку. Дзеянні падчас выяўлення або ўзнікнення пажару. Правы, абавязкі і адказнасць грамадзян у галіне пажарнай бяспекі. Азнаямленне з Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 1993 г. «Аб пажарнай бяспецы». Юрыдычная адказнасць за падпальванне і пажары, якія ўзніклі па неасцярожнасці грамадзян.

Адпрацоўка дзеянняў у выпадку выяўлення пажару ў месцах адпачынку.

### 7. Выніковыя заняткі (1 гадзіна)

Правядзенне тэсціравання на ступень падрыхтаванасці вучняў да дзеянняў у экстрэмальных умовах пажару.

## Раздзел «АХОВА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ»

### 1. Надзвычайныя сітуацыі тэхнагеннага характару (2 гадзіны)

Класіфікацыя НС тэхнагеннага характару. Аварыі на хімічна-, радыяцыйна-, гідрадынамічна-, пажара- і ўзрыванебяспечных аб'ектах і ў камунальна-энергетычных сетках. Аварыі на транспарце. Прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі горада (вобласці), іх небяспека. Магчымыя вынікі НС тэхнагеннага характару. Правілы паводзін пры пагрозе і ўзнікненні НС тэхнагеннага характару. Аварыі з выкідам радыеактыўных або моцнадзеючых рэчываў, іх магчымыя вынікі. Парадак правядзення экстранай эвакуацыі. Спосабы і сродкі аховы ў забруджанай зоне. Аварыі ў метрапалітэне, іх асаблівасці. Тэхнагенныя аварыі ў месцах адпачынку, іх асаблівасці.

### 2. Сучасныя сродкі масавага паражэння. Абарончыя збудаванні грамадзянскай абароны. Сродкі індывідуальнай аховы (1 гадзіна)

Ядзерная, хімічная і біялагічная зброя. Новыя віды зброі масавага паражэння. Прыметы, дзеянне і магчымыя вынікі прымянення зброі масавага паражэння. Віды абарончых збудаванняў грамадзянскай абароны, іх прызначэнне. Правілы паводзін у абарончых збудаваннях.

Індывідуальныя сродкі аховы, іх прызначэнне. Парадак выбару найпрасцейшых сродкаў аховы органаў дыхання і скуры.

### 3. Медыцынская ахова насельніцтва ад вынікаў надзвычайных сітуацый і сучасных сродкаў паражэння (1 гадзіна)

Санітарная апрацоўка людзей. Сродкі медыцынскай аховы. Дэзынфекцыя. Абеззаражванне. Дэзактывацыя. Дэгазацыя. Арганізацыя аказання першай медыцынскай дапамогі пацярпелым.

### 4. Дзяржаўная сістэма папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый (ДСНС) і Грамадзянская абарона (ГА) (1 гадзіна)

Арганізацыя ДСНС у Рэспубліцы Беларусь. Асновы і парадак пастраення (структура). Задачы і функцыі ДСНС. Асноўныя мерапрыемствы, якія ажыццяўляюцца пры функцыяніраванні ДСНС у рэжыме паўсядзённай дзейнасці, рэжыме павышанай гатоўнасці, надзвычайным рэжыме.

Арганізацыя ГА. Мэты і задачы ГА. Арганізацыя сувязі і апавяшчэння. Парадак апавяшчэння насельніцтва. Сігналы ГА. Дзеянні па сігнале «Увага ўсім!» і моўнай інфармацыі. Эвакуацыя.

### 5. Нефармальныя аб’яднанні моладзі (1 гадзіна)

Паняцце нефармальнага аб’яднання. Інтарэсы моладзі і аб’яднанні на іх аснове. Віды маладзёжных аб’яднанняў, іх накіраванасць. Небяспека антыграмадскай накіраванасці асобных маладзёжных аб’яднанняў. Маладзёжныя акцыі і ўдзел у іх. Несанкцыянаваныя выступленні, мітынгі, акцыі і адказнасць за ўдзел у іх.

### 6. Псіхалогія напоўпу і асабістая бяспека (1 гадзіна)

Механізмы ўзнікнення панікі ў месцах масавага знаходжання людзей. Першыя прыметы панікі, ацэнка сітуацыі, прыняцце індывідуальнага алгарытму паводзін, значэнне хуткасці прыняцця рашэння. Спосабы кіравання эмоцыямі натоўпу і ўласнымі пачуццямі. Ахова цела і асобных яго частак падчас даўкі. Аналіз зыходзячых камандаў, хуткасць рэагавання на іх. Арганізаванае масавае мерапрыемства, правілы падпарадкавання парадку яго арганізацыі. Нейтралізацыя дэзарга-

нізуючых настрояў, дзеянняў; формы нейтралізацыі. Асаблівасці асабістай псіхалагічнай аховы ў месцах масавага знаходжання людзей.

### 7. Псіхалогія і правілы паводзін чалавека ў надзвычайных і экстрэмальных сітуацыях (1 гадзіна)

Неабходнасць кантролю псіхалагічнага стану ў экстрэмальных сітуацыях: супрацьстаянне перадпанічным настроям, правільная ацэнка абставін і рэальнай небяспекі, захаванне спакою пры пошуку выйсця са становішча, якое склалася. Псіхалогія ўзаемаадносін групы людзей, якія апынуліся ва ўмовах аўтаномнага выжывання.

### 8. Адпрацоўка элементаў аўтаномнага выжывання падчас паходу (2 гадзіны)

## Раздзел «АХОВА ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ»

### 1. Асабістая бяспека ў сям'і і грамадстве (1 гадзіна)

Уплыў грамадскай думкі на асобу. Змова і падбухторванне, зайздрасць і помста, крыўда і здрадніцтва, іх негатыўная роля ў адносінах паміж людзьмі. Сумленне і прыстойнасць, падтрымка і ўзаемадапамога, сяброўства і бескарыслівасць — аснова нармальных адносін паміж сябрамі. Давер у сям'і. Гвалт у сям'і, узаемная адказнасць бацькоў і дзяцей за гвалтоўныя дзеянні ў аносінах адзін да аднаго. Святы ў сям'і, сярод сяброў, у малазнаёмай кампаніі і бяспека падчас правядзення падобных мерапрыемстваў.

Узаемаадносіны з супрацоўнікамі міліцыі ў розных жыццёвых сітуацыях і ўменне граматна дзейнічаць падчас памылковых абвінавачванняў.

### 2. Палітыка, жыццё, ідэалогія (1 гадзіна)

Інфармацыя афіцыйная і неафіцыйная, спосабы яе адрознення. СМІ і жыццё. Практычныя ўменні па ацэнцы інфармацыі. Небяспека скажэння інфармацыі, спосабы і крыніцы правільнай ацэнкі палітычных, культурных падзей у жыцці грамадства і дзяржавы. Артыкулы Крымінальнага кодэкса, якія датычацца выкарыстання інфармацыі ў антыграмадскіх мэтах, заклiку да змены канстытуцыйнага ладу. Міф пра поў-

ную свабоду. Адказнасць чалавека за свае ўчынкі. Куміры і рэальнае жыццё. Відэакультура і небяспека хлуслівых міфаў. Адказнасць за несанкцыянаваную аўдыё- і відэапрадукцыю. Адказнасць за тыражыраванне забароненай відэапрадукцыі. Адказнасць за падробку грашовых знакаў, дакументаў згодна з дзеючым заканадаўствам.

### 3. Відовішчы і жыццё (1 гадзіна)

Правілы паводзін у месцах масавага знаходжання людзей (футбольныя матчы, масавыя святы, шоу-канцэрты і г. д.). Псіхалагічныя асаблівасці паводзін людзей у месцах масавага знаходжання. Эмацыянальнае напружанне чалавека. Эфект рэзанансу. Адрозненне эмацыянальнага стану чалавека падчас успрыняцця відовішча і стану чалавека ў штодзённым жыцці. Уздзеянне відовішчаў на псіхіку чалавека. Прыёмы аховы ад негатыўнага ўплыву. Прыёмы ўнутранага самакантролю. Ахова жыцця і здароўя ў выпадку надзвычайнага здарэння падчас свята.

### 4. Правілы карыстання маламернымі суднамі. Правілы і прыёмы выратавання на вадзе (1 гадзіна)

Карыстанне маламернымі суднамі на вадаёмах. Дэманстрацыя прыёмаў выратавання на вадзе і прыёмаў першай медыцынскай дапамогі пры тапленні.

### 5. Тэсты (кантрольныя) або залік па курсе заняткаў (1 гадзіна)

---

## ЗМЕСТ


Тлумачальная запіска .......... 3

II клас .......... 8
III клас .......... 11
IV клас .......... 14
V клас .......... 17
VI клас .......... 22
VII клас .......... 26
VIII клас .......... 31
IX клас .......... 38